# Пад знакам Адраджэння

За творчасцю гэтага літаратара сачу даўно і зацікаўлена. Калі наш выдатны паэт Сяргей Законнікаў стаў весці пастаянную рубрыку «Пункт гледжання» у газеце «Свободные новости плюс», ён асабліва раскрыўся як бліскучы публіцыст. Прычым аўтар настолькі яскравы, што яго роздумы чытач з нецярплівасцю чакае, з вялікай асалодаю чытае, разважае над узнятымі пытаннямі, нават захоўвае і збірае разам у выглядзе падшыўкі ў асобную кніжку.

Для публіцыстычных артыкулаў Законнікава характэрна здзіўляючая аператыўная рэакцыя на самыя злабадзённыя падзеі, выразнае раскрыццё шматлікіх адмоўных з'яў сучаснасці на фоне тлумачэння складанага, часта трагічнага лёсу беларусаў. Гэты пастаянны, знясільваючы трагізм прывёў да заняпаду нацыянальнай самасвядомасці, адмаўлення ад роднай мовы, інтэнсіўнай асіміляцыі, слабых магчымасцей для росквіту культуры і эканомікі, нягледзячы на моцныя, але, на жаль, кароткія хвалі беларускага Адраджэння, за якое аддалі жыццё многія выдатныя сыны і дочкі Радзімы.

У той жа час пісьменнік мае непахіснае імкненне паказаць лепшыя якасці, вялікі творчы патэнцыял беларускага народа, цудоўную прыгажосць нашай прыроды, роднай зямлі. Самае галоўнае, што заўсёды прысутнічае ў творчасці Сяргея Законнікава, – гэта цвёрдая вера ў лепшую будучыню Беларусі. Уратаваць і навечна захаваць яе на планеце



можна толькі шляхам аб'яднання ўсіх айчынных сіл пад сцягам нацыянальнага Адраджэння.

Сапраўды, калі мы шчыра хочам «людзьмі звацца» (словы неўміручага прарока Янкі Купалы), жадаем пабудаваць незалежную, дэмакратычную, духоўна і матэрыяльна заможную дзяржаву, то, як заклікае аўтар гэтай кнігі, не зважаючы на рознасць у палітычных поглядах, у веравызнанні, у асабістых памкненнях, павінны ісці душой і сэрцам адзін аднаму насустрач.

Радзім Гарэцкі,
*акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,*
*замежны сябра Расійскай АН*

KAMUNIKAT.org